2) предоставление дополнительного бесплатного обслуживания при приобретении максимального срока тура (например, клиенту, купившему 20-дневный тур, в качестве поощрения добавляется бесплатное обслуживание на 1–2 дня);

3) бонусы в вещественной форме (майки, дорожные сумки, сувениры и т.д.);

4) зачетные талоны – специальный вид бонусов для получения вознаграждения в месте оказания туристских услуг (например, на пользование различными видами транспорта по прибытии к месту отдыха);

5) купоны – своеобразные сертификаты, дающие их обладателю право на скидку при приобретении туристской услуги (помещаются в рекламных объявлениях, рассылаются по почте);

6) «подкрепление» оказываемых туристских услуг – комплекс мер по поддержанию имиджа турфирмы и привлечению новых клиентов: оказание дополнительных услуг, повышенное внимание к клиентам во время отдыха, а также дальнейшее личное внимание к постоянным клиентам (поздравление по почте с праздниками и т.д.);

7) презентации предлагаемых туристских услуг - проведение семинаров, консультационных дней, выездных показов (на выставках);

8) конкурсы и игры;

9) лотереи и викторины.

Сформированные посредством выше обозначенных инструментов конкурентные преимущества позволяют фирмам-участникам туристского рынка Витебской области добиться большей приверженности потребителей и, соответственно, осуществлять более эффективную стратегию конкуренции.

**Заключение.** Проведенное исследование позволило установить, что на конкурентоспособность фирм, функционирующих в рамках туристского рынка Витебской области, влияют следующие факторы:

– соотношение величин цен оказываемых услуг и цен фирм-конкурентов;

– конкурентная политика туристских фирм-конкурентов;

– возможность дифференциации цен на услуги в зависимости от конъюнктуры туристского рынка;

– система скидок на оказываемые услуги;

– наличие ассортиментной диверсификации туристских услуг с позиции удовлетворения конкурентной потребности;

– эффективность рекламной деятельности.

Список литературы

1. Слонимская, М.А., Яшева, Г.А. Маркетинг услуг: учебное пособие / М.А. Слонимская, Г.А. Яшева. – УО «ВГТУ», 2014. – 223 с.

## ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ, МУЗЕЯЎ, АРХІВАЎ І БІБЛІЯТЭК У ГАЛІНЕ АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1920-я гг.

*Т.В. Ушылава*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Чалавек падсвядома імкнецца захаваць адрозненні, індывідуальнасць і асабістую ідэнтычнасць у эпоху высокіх тэхналагічных магчымасцяў і нарастаючай культурнай аднастайнасці. Зварот да вопыту дзейнасці савецкага ўрада ў дадзенай галіне ў 1920-я гг. мае істотнае значэнне для выпрацоўкі шляхоў аптымізацыі сучаснай сістэмы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў краіне.

Мэта дадзенага артыкула – ахарактарызаваць дзейнасць органаў аховы помнікаў гісторыі і культуры ў Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Пры правядзенні даследавання былі выкарыстаны матэрыялы заканадаўчых зборнікаў СССР, папярэднія навуковыя даследванні ў галіне аховы помнікаў гісторыі і культуры. Асноўныя метады пры правядзенні даследвання: эмпірычныя (апісанне, параўнальна-супастаўляльны і апісальна-аналітычны метады) і метады тэарэтычнага пазнання (аналіз, класіфікацыя і аналогія).

Репозиторий ВГУ

**Вынікі і іх абмеркаванні.** З восені 1917 г. ў Петраградзе і Маскве былі створаны і дзейнічалі спецыяльныя камісіі па ахове помнікаў. Але для Беларусі гэты перыяд характарызуецца цяжкасцямі ў сувязі з умовамі ваеннага часу. Заканадаўства РСФСР было не толькі крыніцай для стварэння адпаведных дэкрэтаў на нашай тэрыторыі, але і з'яўлялася адзінай юрыдычнай асновай для дзеянняў па ахове спадчыны. Згодна з Дэкрэтам аб зямлі памешчыцкія, манастырскія, царкоўныя і ўдзельныя землі падлягалі канфіскацыі з усім інвентаром, сядзібнымі пабудовамі і ўсімі прыладамі. На жаль, працэс іх канфіскацыі суправаджаўся масавымі пагромамі, што прыводзіла да страты значнай колькасці каштоўнасцяў. Да таго ж, 20 студзеня 1918 г. быў прыняты Дэкрэт СНК РСФСР «Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных арганізацыях», згодна з якім маёмасць гэтых арганізацый абвяшчалася народным здабыткам.

Да канца ліпеня 1920 г. практычна ўся тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад інтэрвентаў. 24 ліпеня 1920 г. А.Г. Чарвякоў падпісаў загад № 11, у якім усім прыватным асобам прапаноўвалася ў трохдзённы тэрмін паведаміць у Абласны музей аб рознай маёмасці, якая прадстаўляе мастацкую і гістарычную каштоўнасць «для ўліку і прыняцця яго музеем» [2, с. 26]. У сувязі з поўнай адсутнасцю грашовых сродкаў і адмовамі ў зацвярджэнні каштарысаў на расходы ўзнікалі сур'ёзныя праблемы па захаванні культурна-гістарычнай спадчыны. Так, напрыклад, А. Ром у пачатку 1920 г., яшчэ будучы загадчыкам секцыі выяўленчых мастацтваў, накіраваў у губнарасвет рапарт, у якім указваў, што няма нават цвікоў, каб забіць зламаныя дзверы кватэры В. Федаровіча, якая была перададзена пад памяшканне музея [4, с. 48].

У сістэме органаў Народнага камісарыята асветы БССР дзейнічалі дзве структуры, якія займаліся пытаннямі арганізацыі і дзейнасці мастацкіх устаноў. Народны камісарыят асветы і яго падраздзяленні ў першай палове 20-х гг. займаліся фарміраваннем і рэалізацыяй нацыянальнай палітыкі, агульным тэарэтычным і праграмным кіраўніцтвам навуковымі і мастацкімі ўстановамі БССР. Пасля пераходу аддзела мастацтваў Народнага камісарыята асветы ў вядзенне Галоўнага палітыка-асветнага камітэта, пададдзел аховы помнікаў мастацтва і даўніны быў ліквідаваны. Працягнуў дзейнасць гэтага пададдзела Акадэмічны цэнтр Наркамасветы БССР. У склад Акадэмічнага цэнтра ўвайшлі Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў, экспедыцыя па вывучэнні беларускай народнай творчасці, Архіўная камісія, Музейная камісія і Інстытут беларускай культуры [2, с. 42].

Адна з галоўных праблем, рашэннем якой займаўся Наркамасветы – захаванне багатых архіваў. Для забеспячэння архіваў дастатковай матэрыяльнай падтрымкай у 1922 г. было прынята рашэнне перадаць іх у вядзенне ЦВК БССР [2, с. 63]. Але праца архіваў у навуковай частцы заставалася ў падпарадкаванні Наркамасветы. У сакавіку 1923 г. Цэнтрархіў даслаў ва ўсе аддзяленні дырэктыву з указаннямі бліжэйшых задач - выяўленне, улік і ахова архіваў [2, с. 64]. Дзякуючы распрацаваным анкетам, былі сабраныя багатыя матэрыялы з тэрыторыі рэспублікі. Акрамя таго, супрацоўнікі Цэнтрархіва неаднаразова перадавалі Беларускаму дзяржаўнаму музею каштоўнасці, якія трапілі ў іх распараджэнне.

Музейная справа ў дадзены перыяд таксама характарызуецца інтэнсіўнай працай па зборы і інвентарызацыі калекцый. У снежні 1924 г. Савет народных камісараў выдаў пастановы «Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, мінуўшчыны, побыту і мясцовасцяў прыроды, якія з’яўляюцца ўласнасцю ўстаноў і таварыстваў, а таксама прыватных асоб» і «Аб канцэнтрацыі мастацкіх і культурна-гістарычных каштоўнасцяў» [3, с. 36]. Быў забаронены вываз і продаж каштоўнасцяў за мяжу, перадача іх ад аднаго ўладальніка другому [1, с. 96]. Перыядам актыўнага назапашвання фондавых калекцый сталі 1924–1925 гг.

Вялікую цікавасць супрацоўнікі Наркамасветы праяўлялі да пошуку і захавання кніжнай спадчыны. Нацыянальная бібліятэка Беларусі была заснавана ў 1922 г. Фонд бібліятэкі складаў усяго 60 тыс. асобнікаў. У 1924 г. рашэннем камісіі былі створаны Віцебская, Магілёўская і Бабруйская дзяржаўныя бібліятэкі, якія пачалі збіраць і захоўваць кніжныя помнікі [2, с. 67].

У 1925 г. зноў пачала сваю працу камісія па ахове помнікаў даўніны, народнай культуры і прыроды, але цяпер пад кіраўніцтвам Інбелкульта. У 1926 г. выйшла пастанова СНК БССР, якая абвясціла дзяржаўным набыткам 94 помнікі гісторыі і культуры. У гэты час пачалося актыўнае ўдакладненне на аснове друкаваных выданняў і розных дакументаў месцазнаходжання вывезеных з Беларусі каштоўнасцяў і вяртанне іх у рэспубліку. Прыняцце «Асноўных палажэнняў размеркавання архіўных фондаў і матэрыялаў паміж саюзнымі рэспублікамі» (люты 1927 г.) перакрэсліла магчымасць вяртання ў Беларусь каштоўных архіваў

Репозиторий ВГУ

[2, с. 77]. Канец 1920-х гг. стаў найбольш цяжкім этапам у справе аховы помнікаў гісторыі і культуры. У 1928 г. функцыі аховы помнікаў ад Інбелкульта былі перададзены адмысловай камісіі пры Наркамасветы БССР. Згодна з новым палажэннем аб камісіі (1929 г.) у яе склад былі ўведзены упаўнаважаныя па акругах, якія прызначаліся акруговымі выканкамамі [2, с. 100]. Усе выдаткі на ўтрыманне помнікаў павінны былі праводзіцца па каштарысах акруговых выканкамаў.

На жаль, «прызначаныя» супрацоўнікі бяздзейнічалі і помнікі разбураліся. Палітыка партыі і дзяржавы была накіравана на выкананне мэтаў і задач культурнай рэвалюцыі, індустрыялізацыі і калектывізацыі. Следствам гэтага стала здача архіўных матэрыялаў на макулатуру і продаж на замежных аўкцыёнах антыкварыяту і музейных каштоўнасцяў. У 1932 г. спыніла сваё існаванне камісія па ахове помнікаў даўніны, мастацтва і побыту пры Наркамасветы БССР.

**Заключэнне.** Дваццатыя гады мінулага стагоддзя ўнікальныя для Беларусі – палітыка беларусізацыі, якая праводзілася ў рэспубліцы, спрыяла нацыянальнаму адраджэнню. На хвалі "ўздыму" нацыянальнай культуры ствараліся дзяржаўныя органы аховы помнікаў гісторыі і культуры, дзяржаўныя музеі, бібліятэкі і архівы. Нягледзячы на станоўчую дынаміку ў справе захавання спадчыны, ўзнікалі велізарныя фінансавыя і палітычныя праблемы. Любыя спробы беларускай інтэлігенцыі абараніць каштоўнасці неадкладна перарываліся. Пазней адной з формаў ціску сталі рэпрэсіі, якія знішчылі амаль усіх самых яркіх нацыянальных дзеячаў.

Спіс літаратуры:

1. Гужалоўсі, А. А. Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Гужалоўскі. — Мінск : БДУ, 2012. – 303 с. : іл.
2. Клепиков, Н. Е. Культурно-историческое наследие Беларуси, 1917 – 1932 гг. / Н. Е. Клепиков. – Минск: Издательский центр Белорусского государственного университета, 2008. – 150 с.
3. Советское законодательство о памятниках истории и культуры : сборник документов и материалов (1917 – 1972) / Белорусское добровольное общество охраны памятников истории и культуры. – Минск : Полымя, 1972. – 429, [1] с.
4. Хмельницкая, Л. В. Витебские годы Александра Ромма: председатель комиссии по охране памятников / Л. В. Хмельницкая // Бюллетень Музея Марка Шагала. – Витебск: [б.и.], 2010. – Вып. 18. – С. 36–57.

## ТЕНДЕНЦИИ И ФАКТОРЫ МЕЖДУНАРОДНОЙ ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ИНТЕГРАЦИИ

*Е.С. Шахнович*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Прошедший XX в. вошел в историю как век беспрецедентного роста международных экономических связей во всех формах: торговли товарами и услугами, вывоза капитала, производственного кооперирования, научно-технического взаимодействия и миграции рабочей силы. Процесс интернационализации международной хозяйственной деятельности продолжает стремительно нарастать и в XXI веке. Он обусловлен потребностью расширения рынков сбыта продукции в условиях постоянно возрастающей под влиянием научно-технического прогресса концентрации производства и призван содействовать неуклонному росту экономики.

Цель данной публикации состоит в выявлении тенденций и факторов международной экономической интеграции.

**Материал и методы.** В процессе исследования использовались научные издания и монографии. Применились методы научной абстракции и аналитический.

**Результаты и их обсуждение.** Интернационализация производства служит экономической основой современного мирового хозяйства, содействует развитию организационно-экономических форм, которые связывают производство одних стран с потреблением его результатов в других.

Основными тенденциями развития международных экономических отношений выступают процессы международной экономической интеграции, глобализации и транснационализации мировой экономики.

Международная экономическая интеграция представляет сближение и взаимоприспособление национальных экономик, включение их в единый воспроизводственный процесс в интернациональных масштабах. Для преодоления препятствий, создаваемых государственными границами, создаются региональные интеграционные объединения, действующие в соответствии

Репозиторий ВГУ